# Першыя дні вайны

У нядзелю раніцай 22 чэрвеня 1941 года на Хоцімшчыне прачнуліся, як звычанна. Ніхто не падазраваў, што на захадзе ўжо грукоча страшэнная вайна. На пашах мірна пасвіліся каровы, па сенажацях «грабель мільганнем, звонам кос трымцелі ліловыя прасторы». А к поўдню ўжо ва ўсіх вёсках спынілася ўсялякая работа. Людзі збіраліся натоўпамі, абмяркоўвалі жудасную вестку, якую данесла радыё да Хоцімска, а у вёскі — тэлефонаграмы і ганцы з райцэнтра.

А ў 16 гадзін 17 хвілін тэлефаністка Хоцімскага раённага вузла сувязі Шапавалава прыняла тэлеграму № 128 з Масквы наступнага зместу: “Мабілізацыйная. Прэзідыумам Вярхоўнага Савета СССР абʼяўлена мабілізацыя тчк. Першы дзень мабілізацыі 23 чэрвеня. № 2206.

Народны камісар абароны

Маршал Савецкага Саюза

Цімашэнка”.

І праз якую гадзіну ва ўсе сельскія Саветы быў ужо разасланы загад раённага ваеннага камісара Харытонава аб мабілізацыі ваенна-абавязаных першай узроставай групы — ад дваццаці пяці да сарака пяці гадоў.

З раніцы 23 чэрвеня з кожнай вёскі раёна адпраўляліся на прызыўныя пункты жыхары, якія падлягалі мабілізацыі. У іх распараджэнне даваліся і калгасныя коні, строга па мабілізацыйных прадпісаннях.

У гэты дзень перамяшалася ўсё: заліхвацкія разлівы напеваў гармонікаў, вясёлыя і жалобныя песні, плач і лямант жанчын, якія праводзілі на вайну дзяцей, бацькоў, мужоў, братоў і сваякоў.

Але ніхто яшчэ не ведаў тады памераў гора, якое прынясе вайна, што кожны чацвёрты жыхар Беларусі не перажыве вайны.

— Беражы сябе!

— Вяртайся жывы!

— Чакаем з перамогай!

— Грудзі ў крыжах, ці галава ў хмызняку.

А пад вечар 23 чэрвеня адбылося пасяджэнне Хоцімскага РК КП(б)Б, на якім у першую чаргу была заслухана інфармацыя раённага ваеннага камісара Харытонава аб ходзе фарміравання і адпраўкі каманд, што мабілізаваны ў Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію.

У прынятай на пасяджэнні пастанове адзначалася, што мабілізацыя ў раёне праходзіць на высокім палітычным і арганізацыйным узроўні. З ліку прызваных у РСЧА да пачатку пасяджэння райкома прыняты на зборных пунктах 91 працэнт мабілізаваных. Маральны настрой іх добры. Аднак па Першамайскім сельсавеце з-за недастатковай палітработы з боку старшыні сельсавета Кавалёва, пярвічнай партарганізацыі і палітупаўнаважаных Сычова і Лупекіна частка мабілізаваных зʼявілася на пункт збору п´янымі.

Асобныя арганізацыі на пункт збору не даставілі патрэбную колькасць коней, аўтатранспарту і трактароў.

Сакратарам пярвічных партарганізацый і старшыням сельсаветаў прапанавана ўзмацніць палітмасавую работу сярод насельніцтва ў калгасах і на прадпрыемствах, растлумачваць працоўным іх абавязкі перад Радзімай ва ўмовах ваеннага часу.

На пасяджэнні райкома была створана транспартная камісія для аказання дапамогі ў сродках перасоўвання эвакуіраваным.

Узначаліў камісію член райкома, старшыня райвыканкома Апанасенка. У склад камісіі ўвайшлі сакратар райкома Леаненка, начальнік міліцыі Шкляр і райваенком Харытонаў.

Заслухана было і пытанне аб выкананні плана мясапаставак. Райком абавязаў райупаўмінзага Тулікава забяспечыць выкананне плана мясапаставак па ўсіх сектарах гаспадарак.

Для аховы мастоў і тэлеграфна-тэлефоннай сувязі сакратару райкома камсамола было прапанавана вылучыць 30 камсамольцаў з Хоцімска і накіраваць іх у распараджэнне начальніка міліцыі.

Чарговае пасяджэнне райкома КП(б)Б адбылося праз дзень, 25 чэрвеня. На гэты раз абмяркоўвалася пытанне аб замене мабілізаваных кадраў раёна. Дакладчык, загадчык райза Слісаў адзначаў, што ход замены старшынь калгасаў, рахункаводаў, брыгадзіраў, жывёлаводаў і трактарыстаў праходзіць здавальняюча.

У пастанове па гэтым пытанні прапанавалася смялей вылучаць жанчын на кіруючую работу ў калгасах, у Хоцімскай МТС было вырашана арганізаваць кароткатэрміновыя курсы жанчын-трактарыстак, у першую чаргу з ліку камсамолак.

Аддзелу агітацыі райкома партыі было даручана падабраць на месца мабілізаваных кіраўнікоў агітшкол і агіткалектываў з ліку інтэлігенцыі, партыйна-камсамольскага і калгаснага актыву, узмацніўшы палітмасавую работу сярод насельніцтва раёна.

У 13 гадзін дня 25 чэрвеня райком адправіў абласному камітэту партыі палітданясенне, што на дадзены момант у раёне прызвана ваеннаабавязаных 98,5 працэнта, коней, фурманак і фуражу 100 працэнтаў, аўтамашын 85,6 працэнта і трактароў 80 працэнтаў. У такім жа палітданясенні на наступны дзень паведамлялася, што да 14 гадзін 30 хвілін 26 чэрвеня ўсе мабілізацыйныя паказчыкі выкананы на 100 працэнтаў.

Пачаліся трывожныя дні. Штодзень у небе Хоцімшчыны з усходу на захад днём і ўначы праляталі эскадрыллі савецкіх «ястрабкоў» і бамбавозаў. А ў пачатку ліпеня высока ў небе пачалі з’яўляцца і адзінокія самалёты з чорнымі крыжамі на крылах. Яны падоўгу кружылі і выглядвалі абстаноўку. Гэта былі фашысцкія самалёты-разведчыкі.

Праз Хоцімшчыну з захаду ішлі натоўпы бежанцаў на ўсход, калгаснікі заходніх раёнаў гналі статкі кароў на ўсход, каб яны не дасталіся ворагу.

Адпраўляліся ў эвакуацыю і многія жыхары Хоцімскага раёна, выганяліся статкі калгаснай жывёлы і таксама накіроўваліся на ўсход.

У канцы ліпеня стала відавочным, што на Хоцімшчыну насунецца хмара акупацыі. Таму райком партыі распачаў падрыхтоўку груп камуністаў і беспартыйных для арганізацыі падполля і партызанскага руху ў тыле ворага на тэрыторыі раёна.

Знішчаліся важныя дакументы. У партыйных архіўных фондах захаваўся акт ад 18 ліпеня 1941 года, па якім камісія ў саставе сакратароў Хоцімскага райкома партыі К.Е. Чумакова, П.Г. Шлома і заг. улікам М.Л. Рэлінай знішчыла (спаліла) наступныя дакументы
РК КП(б)Б:

1. Справы з сакрэтнай перапіскай.
2. Справы з пратаколамі пасяджэнняў райкома.
3. Дырэктывы ЦК КП(б)Б і абкома.
4. Справы з агульнай перапіскай.
5. Справы па ўліку.
6. Справы з фінансавымі дакументамі і іншыя.

Апошняе пасяджэнне РК КП(б)Б перад акупацыяй Хоцімска адбылося 28 ліпеня 1941г., на якім прысутнічалі члены райкома Леаненка, Шлома, Апанасенка, Казакевіч, запрошаныя пракурор Зуёнак, начальнік міліцыі Шкляр і райваенком Харытонаў.

Абмяркоўваліся паводзіны начальніка РА НКУС Шкляр у ваенны час. У выступленнях Шлома, Апанасенкі, Зуёнка, Машаруева і Леаненкі адзначалася, што Шкляр няўмела паставіў работу ў ваенны час, паводзіць сябе нястрымана, праяўляе баязлівасць і панікёрства. Няўмела выкарыстоўвае свой апарат, у сельсаветы не выязджае, участковых не інструктуе. Тым самым губляе свой аўтарытэт перад падначаленымі. Райком указаў Шкляру на яго нераспараджальнасць як начальніка РА НКУС і патрабаваў карэннага паляпшэння ўсёй работы райаддзялення міліцыі. Гэты пратакол быў падпісаны сакратаром Хоцімскага райкома КП(б)Б Леаненкам.

Акупацыя раёна гітлераўскімі полчышчамі пачалася 14 жніўня 1941 г. А 16 жніўня адбыўся апошні бой воінаў-кавалерыстаў на яго тэрыторыі, паблізу граніцы з Суражскім раёнам Расіі. Там, дзе сёння стаіць помнік героям-абаронцам Радзімы і нашай Хоцімшчыны.

Наступілі змрочныя часы акупацыі.

*П. Чубакоў, В.Даўгалёў.*

**Чубакоў, П. Першыя дні вайны** / П. Чубакоў, В. Даўгалёў // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Хоцімскага раёна / рэдкалегія: Г. П. Пашков (галоўны рэдактар) [і інш.]. — Мінск, 2003. — Ішла вайна народная. — С. 187.